**Вайсковае** братэрства мацней за роднасць // Патрыёт (Ушачы). — 2024. — 14 лют. — С. 3.

**ВАЙСКОВАЕ БРАТЭРСТВА МАЦНЕЙ ЗА РОДНАСЦЬ**

**Вайна ў Афганістане, у якой прымалі ўдзел савецкія войскі, працягвалася 9 гадоў 1 месяц 21 дзень. Інтэрнацыянальны абавязак выканалі амаль 30 тысяч беларусаў, з іх больш за 700 загінула, 870 салдат і афіцэраў вярнуліся з вайны інвалідамі. У баявых дзеяннях прымалі ўдзел каля сотні ўраджэнцаў і жыхароў Ушацкага раёна. Напярэдадні юбілейнай даты вываду савецкіх войск з Афганістана мы падрыхтавалі інфармацыйную падборку, якая датычыцца тых падзей.**



**Тэхнік-пілот верталёта Міхаіл Хрыпач** першы раз служыў у Афганістане ў 1983–1984 гадах, вярнуўся з ордэнам «Чырвонай Зоркі» і званнем старшы лейтэнант. Капітана атрымаў за Чарнобыль – з 14 ліпеня па 25 верасня 1986-га года завісаў над палаючым рэактарам і тушыў яго, скідваючы мяшкі з пяском. Пра ордэны «За службу Радзіме ва Узброеных сілах» не даведаўся – быў збіты 1 кастрычніка 1988 года. Родных апошні раз бачыў у маі, калі забіраў з раддому ў Полацку жонку і дачку.

**Аляксандр Клачок** аб нараджэнні дачкі Юлі даведаўся з тэлеграмы 14 лютага 1983-га, 24-га заканчвалася камандзіроўка, і ён збіраўся прыехаць дамоў. А 21-га ў Дубінцы яго бацькі атрымалі чорную вестку – верталёт пацярпеў крушэнне. Аляксандр Васільевіч доўгі час не лічыўся воінам-інтэрнацыяналістам, паколькі служыў у пагранічных войсках, якія дыслацыраваліся на

тэрыторыі Саюза ў Марах, разбіўся яго верталёт таксама на сваёй зямлі. Аднак у А.Клачка больш 40 баявых вылетаў у Афганістан і па адной з версій яны «цягнулі» палаючую машыну да мяжы, каб не трапіць у рукі душманаў.

**З ліста Мікалая Ключонка** бацькам: «Стаіць жудасная спёка. Рукі ў хлопцаў, ды і ў мяне патрэскаліся. Але нічога, загояцца. Хадзілі на баявое заданне. Выканалі яго. Я абяцаю, што вярнуся з медалём. Бацька, купі паляўнічага сабаку, каб ён вырас, пакуль я прыеду». Кулямётчык Мікалай Ключонак ахоўваў вывад войскаў праз Саланг і сам ужо пакрыху збіраўся дадому. Купіў дыпламат, гадзіннік, дзве пачкі цукерак. Усё гэта, як і ордэн «Чырвонай Зоркі», трапіць у Мажуйкі, толькі без яго.

**Афіцэр Валерый Галаскокаў**: «Можна забыцца на крыўду, зневажанне, але не забыць Афганістан, дзе кожны дзень знаходжання роўны подзвігу. Дзе дружба мяжуе з братэрствам мацней чым роднасць. Параненых баявыя сябры на руках неслі ў лагер, мёртвых – таксама. Там усё агульнае: апошняя цыгарэта, кавалак сухара і глыток вады. І ўсім аднолькава: і афіцэру, і сяржанту, і салдату».

У маі 1988 года прэзідэнтам рэспублікі Афганістан быў зацверджаны медаль «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». У нашым раёне ў кастрычніку гэтага года першымі ўзнагароду атрымалі **Ігар Лёля**, **Анатоль Жаваранак** і **Мікалай Юркевіч**.

У канцы васьмідзясятых пры Ушацкай школе працаваў клуб «Дэсантнік», у якім **Аляксандр Казьянін** і **Алег Рагавешка**, якія прайшлі Афган, рыхтавалі юнакоў быць гатовымі да воінскай службы. А пры раённым аддзяленні ДТСААФ у васьмідзясятыя-дзевяностыя гады праводзіліся спаборніцтвы па матаспорце, прысвечаныя памяці загінуўшых воінаў-землякоў.

**Вадзіцель БТР Леанід Міхаль**: «Пасля шпіталя ў Ашхабадзе мне прапаноўвалі застацца служыць на месцы. Адмовіўся, так прывык да сваіх рабят. Ды і службы ў Саюзе ўжо не ўяўляў. Пасля дэмбелю нязвыкла было ісці па горадзе без аўтамата, падспудна сяздела думка: раптам небяспека, а нечым абараняцца».

**Мікалай Джураеў**: «Паўгода вучобы на вадзіцеля БМП і паўтара – у Афганістане. Наша машына – гэта перасоўны разведвальны пункт, экран, ЭВМ, трэба было перадаваць каардынаты для абстрэлу. Занятак небяспечны. Калі вярнуўся дадому, даведаўся, што камандзір нашай БМП загінуў. Мы ж аднойчы злавілі варожага разведчыка, за што і атрымаў медаль «За баявыя заслугі».

Віктар Прахарэнка служыў у батальёне абслугоўвання трубаправодаў, па якіх вялося перапампоўванне рэактыўнага паліва: «Маджахеды наўмысна прабівалі трубу ў чаканні, калі мы пачнем яе рамантаваць, таму рабіць гэта звычайна даводзілася пад прыкрыццём агню БТРаў».